Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. ЧАЦВЕР №202 (28566)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Выпіска з радзільні па-беларуску



Ці рыхтавацца да сямейнага жыцця са школы?



Чым займаецца доўла

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй ХУДЫК,** міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:

*«Устойлівае развіццё эканомікі Беларусі немагчыма без збалансаванага выкарыстання і ўзнаўлення мінеральна-сыравінных рэсурсаў, якія з'яўляюцца асновай матэрыяльнай вытворчасці і нацыянальнай бяспекі. У сувязі з гэтым адзін з прыярытэтаў у дзейнасці міністэрства — зніжэнне залежнасці эканомікі краіны ад імпартаванай мінеральнай сыравіны і павелічэнне экспартнага патэнцыялу Беларусі шляхам паставак за мяжу прадукцыі, выробленай з выкарыстаннем уласных карысных выкапняў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9585 | ▼ |
| Еўра | 2,3030 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0341 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0741 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ШКОЛЬНЫ ЛЕС



У школе вёскі Германавічы Шаркаўшчынскага раёна ўжо 47 гадоў існуе сваё — школьнае — лясніцтва, якое падпарадкоўваецца Дзісенскаму лягсасу. Вучні-лесаводы дапамагаюць лясной гаспадарцы ў навядзенні парадку на лесасеках, абгароджваюць мурашнікі і вешаюць шпакоўні, удзельнічаюць у тыднях пасадкі лесу, іх запрашаюць дапамагаць на лягсасаўскім гадавальніку. Кірує школьным лясніцтвам эколаг, настаўнік біялогіі Марына Фёдарава. А за ўзорную працу юных ляснікоў Беларускае таварыства лесаводаў пашыла і перадало навучальнай установе дзесяць камплектаў парадный прафесійнай формы.

На здымку: школьныя лесаводы Лізавета Філіпёнак, Сняжана Кукуць, Ангеліна Чарняўская, Карына Мядзелец, Валерый Яворскі, Уладзіслаў Бондар і Валянцін Кукуць разам з настаўніцай Марынай Фёдаравай даследуюць стагадовыя дрэвы былога панскага парку.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Год навукі

## АРЫГІНАЛЬНЫЯ ЛЕКІ ЦІ ДЖЭНЕРЫКІ?

**Які шлях абраць, каб не адстаць ад канкурэнтаў...**




**У 2010 годзе перад фармацэўтычнай прамысловасцю была пастаўлена стратэгічная задача — да 2015 года долю айчынных прэпаратаў павінна дасягаць на ўнутраным рынку не менш за 50 працэнтаў. З тых часоў была наладжана вытворчасць 537 новых лекавых сродкаў. У Беларусі зарэгістравана зараз больш за 5 тысяч найменняў лекаў. З іх беларускіх — 32 працэнты. За чатыры гады аб'ём вытворчасці лекаў павялічыўся ў 1,5 раза, а імпарт скараціўся на 236 найменняў.**

СТАР. 4

■ Наша спадчына

## ХРАМ БЕЗ ЗВАНОЎ

**Святая Варвара вярнулася ў Райцу**

**Гэты храм унікальны сваім архітэктурным вобразам у выглядзе карабля, дзіўнай 200-гадовай гісторыяй існавання з амаль поўным знішчэннем, паступовым аднаўленнем і сучаснымі службамі без званоў. А яшчэ ён дагэтуль захоўвае ў сабе таямніцы: уваход у пахавальню і падземны ход у былы прычтавы дом, ці, як тут кажуць, ніжнюю царкву. Цяперашні настаяцель храма Святой велікамучаніцы Варвары айцец Аляксей ШЫШКІР стварыў тут музейнае памяшканне, батлеечны тэатр з акцёрамі-дзецьмі і арганізаваў нядзельную школу, заняткі якой часта праходзяць у яго дома.**

СТАР. 13



Настаяцель храма Святой велікамучаніцы Варвары айцец Аляксей ШЫШКІР стварыў батлеечны тэатр.